**Марафон мерапрыемстваў Тыдня роднай мовы, які быў арганізаваны вучонымі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, сёлета аб'яднаў шмат насамрэч цікавых і разнастайных мерапрыемстваў**



Тыдзень роднай мовы для Інстытута мовазнаўства ў гэтым годзе пачаўся з Віцебска, дзе ў абласной бібліятэцы прайшла творчая сустрэча «Пароль неўмiручасці – родная мова». Шмат увагі тут было нададзена даследаванням і працы па вывучэнні гаворак Віцебшчыны. Таксама навукоўцы прынялі ўдзел у дзвюх сустрэчах – у Віцебскім дзяржаўным універсітэце і Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Цікава, што ў апошнім гаворка ішла на тэму «Фарміраванне моўнай кампетэнцыі будучых урачоў ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму Беларусі». Гаварылася пра склад старабеларускай медыцынскай тэрміналогіі, дзейнасці Медыцынскай секцыі пры Інбелкультце, заснаванай у 1924 г., першым падручніку на беларускай мове для вышэйшых медыцынскіх навучальных устаноў, пра перакладныя спецыяльныя слоўнікі XX ст.

Кожны дзень моўнага марафону быў насычаным сустрэчамі з мовазнаўцамі, пісьменнікамі, тымі, хто цікавіцца родным словам і робіць свой унёсак у яе папулярызацыю. Але галоўнай падзеяй стала Рэспубліканская дыктоўка па беларускай мове, якая прайшла ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі і да якой мог далучыцца кожны жадаючы. У гэтым дапамаглі канал «Культура» Беларускага радыё і анлайн-трансляцыя праз YouTube.

Як адзначыў дырэктар Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі Ігар Капылоў, тэкст дыктоўкі сёлета прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Прычым тэкст складзены паводле матэрыялаў СМІ. «Колькасць удзельнікаў дыктоўкі расце штогод, сёлета зарэгістравалася больш за 5 тыс. удзельнікаў. Прычым не толькі з розных куткоў Беларусі, але і многіх іншых краін свету», – зазначыў Ігар Лявонавіч.

Як прызнаваліся самі ўдзельнікі дыктоўкі, пісаць яе прыходзяць не першы раз. Гэта своеасаблівая даніна павагі роднай мове.

*Ніжэй чытайце пра некаторыя цікавыя мерапрыемствы Тыдня роднай мовы.*